# НА ДЫСТАНЦЫІ ЭМОЦЫЙ І РЭЙТЫНГАЎ

**Тэлеканал «Беларусь 5» малады па мерках часу (пачаў афіцыйна сваё вяшчанне ў снежні мінулага года), але яго дэбют у эфіры суправаджаўся яркімі падзеямі. Напрыклад, нядаўняя Алімпіяда ў Сочы. За час яе правядзення рэйтынг канала ўзрос у шэсць разоў, а агульны час вяшчання дасягнуў 400 гадзін. Наперадзе не менш яркія падзеі — чэмпіянаты свету па хакеі, футболе — словам, зялёнае святло для творчасці і замацавання сваіх пазіцый на медыйнай прасторы... Пра спрыяльныя ўмовы, бліжэйшыя перспектывы эфіру і адметныя вынікі расказаў дырэктар тэлеканала «Беларусь 5» Павел БУЛАЦКІ.**

## АЛІМПІЯДА: УРАЖАННІ І ВЫНІКІ

— Самае яскравае ўражанне — гэта, безумоўна, выступленне нашай нацыянальнай зборнай. Столькі медалёў і такой вартасці мы ні на адной з Алімпіяд яшчэ не заваёўвалі. Пяць залатых — гэта паказчык! Дзякуючы нашым спартсменам меркаванне пра нашу краіну вырасла ў разы. Але калі Першы канал паказваў усё самае топавае — фінал, адкрыццё і закрыццё Алімпійскіх гульняў, мы паказвалі практычна ўсю Алімпіяду. І што немалаважна — усе віды спорту ахапілі, у тым ліку і тыя, што развіваюцца. Таму магу годна заяўляць: каманда Белтэлерадыёкампаніі адпрацавала без заўваг, на «выдатна».

Нашы трансляцыі ў аб'ёме склалі каля 400 гадзін вяшчання, улічваючы і трансляцыю Алімпіяды, і інфармацыйныя сюжэты. Такіх лічбаў не было за ўсю гісторыю беларускага тэлебачання. Сёння на «Беларусь 5» ужо па завяршэнні Алімпіяды паказваем самыя цікавыя спартыўныя спаборніцтвы, бо не ўсе ж мелі магчымасць па буднях адсочваць сітуацыю. І нам тэлефануюць аматары спорту, якія з задавальненнем глядзяць медальныя гонкі, біятлон, фрыстайл. Калі ў нечым мы самыя моцныя, то, лічу, пра гэта трэба расказваць».

## ПЕРСПЕКТЫВА Ў ЗНАЧНЫХ ПАДЗЕЯХ

— Калі гаварыць пра Паралімпійскія гульні, то мы не куплялі трансляцыі. Бясспрэчна, такія спаборніцтвы — гэта перамога людзей, іх сілы духу, але не кожны глядач здольны вытрымаць такое відовішча. Не ўсе ведаюць, як працуюць на вынік гэтыя людзі. Трэба паказваць, што яны працягваюць барацьбу і з'яўляюцца годным прыкладам для многіх. Іх імкненне патрабуе павагі, і пра іх павінны ведаць. Таму будзем рыхтаваць спецыяльныя праекты пра Паралімпіяду, але ў асноўным асвятленне яна атрымае ў інфармацыйных выпусках, як на пятым, так і на іншых каналах Белтэлерадыёкампаніі. Магчыма, нават у бліжэйшы час зладзім з нашым Паралімпійскім камітэтам сумесны праект пра паралімпійскі рух у нашай краіне.




Што датычыцца чэмпіянату свету па хакеі, то ён атрымае самае шырокае асвятленне. Пакажам усе матчы на «Беларусь 5» і на «Беларусь 2». А фінал — на «Беларусь 1».

Акрамя гэтага, з'явіцца спецыяльная праграма, прысвечаная чэмпіянату — журналісты будуць выходзіць з гасцямі ў эфір непасрэдна з месца падзей.

Плануецца поўнасцю паказаць чэмпіянат свету па футболе, які будзе праходзіць у Бразіліі і, варта заўважыць, параўнальны па рэйтынгах з Алімпіядай у Сочы.

## НОВЫЯ ГАЛАСЫ Ў ЭФІРЫ І ПЕРШАЕ «БАЯВОЕ ХРЫШЧЭННЕ»

— Перад запускам тэлеканала мы праводзілі вялікі кастынг каментатараў і не будзем на гэтым спыняцца. Plануем перад чэмпіянатам свету па хакеі зладзіць яшчэ адзін. Хочацца, каб у эфіры гучалі новыя, маладыя галасы, што можа спрыяць і прыходу новай глядацкай аўдыторыі на канал.

На першым кастынгу мы адабралі 5 чалавек, і практычна ўсе яны атрымалі доступ да эфіру. Усім даём магчымасць практыкавацца. Тыя, хто пачаў раней выступаць (каментатары спаборніцтваў па тэнісе, біятлоне, футболе) — ужо ў пэўнай ступені паказалі сябе. Мы прыгледзеліся да людзей. Стала зразумела, каму і што бліжэй. Некаторых у бліжэйшы час будзем браць у штат.

Прапаноўваем усім ахвотным супрацоўнічаць з нашым тэлеканалам. Галоўнае ў нашай працы — любіць і паважаць спорт. Мае значэнне і адсутнасць у чалавека дэфектаў мовы. Павінна прысутнічаць жывая рэакцыя на тое, што адбываецца на экране. Каб зразумець, як кандыдат валодае матэрыялам, голасам і паводзіць сябе ў працэсе працы, просім дасылаць анкеты і відэазапіс з каментарыем таго ці іншага спаборніцтва, а потым адбіраем тых людзей, якіх запрашаем на праслухоўванне ў студыі.

**Алена ДРАПКО.**



**Па гарызанталі: 5.** «Пад дажджамі восеньскай расы/ Хай жа расцвітуць зноў ...» **6.** «Жытнёвае поле, лясы і азёры, / Крынічанька ў лузе і ў небе ...» **9.** «Ляцелі гусонькі цераз сад, / Клікнулі дзевоньку, ой, на ...». **11.** «Чуеш ... і чуеш вечар, / Чуеш — ціха шапоча сад?» **12.** «Шкада ... мне, што ў небе дагарае / На ўсходзе дня майго, якому ружавець». **15.** «Дык бяры ж ты ..., працавітую дзяўчыну». **16.** «Шэпчуцца ... з калінаю / Ў шумнай даліне над ярам». **17.** «Ой, ляцелі, ой, ляцелі, ой, ляцелі ..., / Дударыкі, дударыкі, дударыкі, дудары». **19.** «... на пасашок — на марозе кажушок». **20.** «Як паходня твой шаль ружавее, / На зямлі я і ты і ...». **24.** «А стамлёныя рукі вольна ўшыркі раскіну, / А нагамі ў ... — хай накрые туман». **25.** «Пачуцці ў нас сёння адны: / Мы хочам, каб мірнае ... не знала пажару вайны». **26.** «Не магу я знайсці тое ..., /Каб красу расказала тваю». **29.** «Звіняць ёй завушніцы / Усё пра маё ...». **32.** «Што скажу, схаваю як ... той дубровы? / Аж ў хату прынясла пах чабаровы». **33.** «Летняя ... купальная яснай растаяла знічкаю». **34.** «І слату, і нягоды, і начныя ..., / І агні партызанскіх кастроў». **35.** «Поўня белая яблыкам спелым на ... твае упадзе».

**Па вертыкалі: 1.** «Люблю цябе, мой ... родны, / Дзе льецца Нёман срэбраводны». **2.** «Кінуў ... касіць, пачаў мамку прасіць». **3.** «У дружбакоў маіх згарэла хата, / Ім новую будуе ...». **4.** «Там кружыцца ... над роднаю хатай, / Чакае матуля мая». **7.** «Лёс, як настой на ..., / Але прыйшло выратаванне — маё каханне да цябе». **8.** «Зорка ... ўзышла над зямлёю, / Светлыя згадкі з сабой прывяла». **10.** «Там, дзе сосны, там і лес, / Дзе парог, там ...». **13.** «Ты з любоўю, ад сэрца нам дорыш на радасць / І ... свае, і красу таямніц». **14.** «Разумею цяпер, чаму з выраю / Жураўлі на ... ляцяць». **16.** «У суботу ... ехаў ля ракі, / Пад вярбой Алёна мыла ручнікі». **18.** «... наша слаўная Нёман — / Чысцейшая чэрвеньскіх рос». **21.** «І тую ўтульную мясцінку, дзе мы пілі кляновы сок, / І тую вузкую сцяжынку, што быццам жоўты ...». **22.** «Добры ..., дзяўчыначка, куды йдзеш? / Скажы ж ты мне праўдачку, дзе жывеш?» **23.** «Я вярнусь да цябе, сінявокая, / Калі ў ... адзенецца край». **27.** Ой, калядачкі, бліны-ладачкі, / Ой, люлі-люлі, бліны-ладачкі, / к..., к..., к...» **28.** «Я ўсё жыццё, як бы жывой вадой, / П'ю — не нап'юся з гэтага струменя, / І кожны вечар, песня, ты са мной, / І кожны ... ты са мною, песня». **30.** Ой, ... , і слава, і песня/ Народа майго і зямлі...» **31.** «Сакавітыя ... мурожныя не заменіш нічым і нідзе, / І зямлю, дзе сцяжыначка кожная ў прыветлівы дом прывядзе».

**Уладзімір ЯКУХІН,** *г. Віцебск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 5. Верасы. 6. Жаўрук. 9. Пасад. 11. Вецер. 12. Заранкі. 15. Яніна. 16. Явар. 17. Камары. 19. Чарка. 20. Завея. 24. Даліну. 25. Неба. 26. Слова. 29. Каханне. 32. Водар. 33. Ночка. 34. Паходы. 35. Далоні.
**Па вертыкалі:** 1. Бераг. 2. Яська. 3. Талака. 4. Бусел. 7. Палыне. 8. Венера. 10. Ганак. 13. Паданні. 14. Палессе. 16. Янка. 18. Рака. 21. Паясок. 22. Вечар. 23. Кветкі. 27. Каляда. 28. Ранак. 30. Нёман. 31. Пожні.

■ Выстава

# Спорт пад мастацкім соусам

**Да чэмпіянату свету па хакеі, які сёлета пройдзе ў Мінску, рыхтуюцца і беларускія мастакі. У канцы красавіка ў Палацы мастацтва адкрыецца выстава, прысвечаная спорту. У замежных гасцей з'явіцца ўнікальная магчымасць не толькі пазнаёміцца са спартыўнай гісторыяй нашай краіны, але і пабачыць тых, хто яе ствараў і стварае.**

Як прызналіся члены Беларускага саюза мастакоў, у экспазіцыю ўвойдуць як творы, якія захоўваюцца ў музеі алімпійскай славы Нацыянальнага алімпійскага камітэта, у архіве Міністэрства культуры, у прыватных калекцыях мастакоў, так і новыя работы.

Тое, што эксклюзіў усё ж такі будзе, — дакладна. У той час, як увесь свет заміраў у прадчуванні алімпійскіх медалёў, а мы сачылі за выдатнымі вынікамі нашых спартсменаў, кіраўнік студыі ваенных мастакоў Мікалай Апіёк не расставаўся з пэндзлем і фарбамі. Ён пісаў Дар'ю Домрачаву.

— Мяне ўзрушылі яе словы пасля першага медаля: «Для мяне Алімпіяда не скончылася», — удакладняе Мікалай Апанасавіч. — Гэты зарад перадаўся і мне, бо, што ні кажы, а мы ўсе жылі Алімпіядай. Увогуле, нельга пісаць любы твор без эмацыйнага зараду. Тым больш калі размова ідзе пра спорт.

На працягу трох дзён ідэя была рэалізавана. І толькі пасля таго, як Дар'і Домрачавай прысвоілі званне Героя Беларусі, Мікалай Апіёк дапісаў на палатне патрэбныя два словы.

Або, напрыклад, мы жылі ў чаканні ўжо паралімпійскіх медалёў, а ў майстэрні Мікалая Апіёка на першым плане знаходзілася палатно «Боль Перамогі», на якім адлюстраваны паралімпійцы. Прычым гэты твор быў напісаны яшчэ тады, калі пра міжнародныя спаборніцтвы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі мала хто і ведаў.

— Гэта было ў пачатку 1980-х, калі я ўпершыню ў Мінску пабачыў спаборніцтвы інвалідаў, — успамінае Мікалай Апіёк. — Тады я нават і падумаць не мог, што такое бывае! І гэтыя мужныя, у першую чаргу, духам людзі мяне настолькі ўразілі, што я не мог не выказаць ім павагу.

У калекцыі мастака — і партрэты чатырохразовай алімпійскай чэмпіёнкі Вольгі Корбут, трохразовага алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Мядзведзя, двухразовай алімпійскай чэмпіёнкі Кацярыны Карстэн. Кожнага з іх Мікалай Апіёк ведае асабіста.

Беларуская вяслярка неаднойчы была ў яго майстэрні. Ды не адна, а са сваім мужам-немцам. Пазіраваў тут для творцы і галоўны барэц краіны. Савецкую гімнастку мастак маляваў у Гродне. Вольга там жыла і трэніравалася. Мікалай Апанасавіч працаваў у Гродзенскім драматычным тэатры. У вольныя ад працы гадзіны ён хадзіў да яе на трэніроўкі, рабіў эскізы. А ўжо дома ў цішыні ствараў партрэт дзяўчынкі з коскамі.

Мяркуецца, што ўсе гэтыя творы Мікалая Апіёка ўбачаць падчас выставы і турысты. Спадзяёмся, што знаёміцца з нашымі спартсменамі ім не прыйдзецца: яны павінны іх ведаць. Проста паглядзяць на іх пад іншым ракурсам. Мастацкім.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара.**



Гераіня Беларусі Мікалая Апіёка.

Даты | Падзеі | Людзі

**1789** год — 225 гадоў таму нарадзіўся Вінцэнцій Бучынскі, беларускі філосаф, тэолаг, крытык. Выкладаў рыторыку і паэтыку ў езуіцкіх калегіумах Мсціслава і Віцебска, затым быў прафесарам філасофіі Полацкай езуіцкай акадэміі. Стварыў першы ў Беларусі літаратурна-навуковы часопіс «Полацкі штомесячнік», на працягу ўсяго часу выдання быў яго рэдактарам. У 1830-1840 гг. выкладаў філасофію ў навучальных установах Аўстрыі і Бельгіі. У Вене выйшаў яго трохтомны твор «Філасофскія разважанні» на лацінскай мове. Пакінуў багатую рукапісную спадчыну, якая ўключае працы па гісторыі філасофіі, гісторыі Беларусі, Польшчы, пытанняў рэлігійнага жыцця. Памёр у 1853 годзе.

**1921** год — заключаны Рыжскі мірны дагавор. У лістападзе 1918 года, пасля паражэння Германіі ў Першай сусветнай вайне, Польшча была абвешчана незалежнай дзяржавай. Паўстала пытанне аб межах новай дзяржавы. Асноўнай мэтай кіраўніцтва на чале з Юзэфам Пілсудскім было аднаўленне Польшчы ў гістарычных межах Рэчы Паспалітай 1772 года, з гэтай прычыны пачаўся ўзброены канфлікт з Савецкай Расіяй. 18 сакавіка 1921 г. паміж варагуючымі бакамі ў Рызе быў заключаны мірны дагавор. Згодна з дакументам, да Польшчы адышлі заходнія землі Украіны і Беларусі. Дагавор дзейнічаў да 17 верасня 1939 года, калі ў сувязі з распадам польскай дзяржавы былі ануляваны ўсе дамовы і пагадненні, а Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь увайшлі ў склад Савецкага Саюза.



**1939** год — 16 сакавіка споўнілася 75 гадоў з дня нараджэння (вёска Новае Хараброва Аршанскага раёна) Уладзіміра Архіпавіча Лабунова, вядомага беларускага вучонага, акадэміка, дыпламата, грамадскага дзеяча, члена савета рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя». У самым пачатку 1990-х, з'яўляючыся народным дэпутатам СССР, ініцыяваў стварэнне БНПА як інструмента захавання навукова-вытворчага патэнцыялу, партнёрскіх сувязяў, выпрацоўкі прамысловай і навукова-тэхнічнай палітыкі ва ўмовах тых трансфармацый, якія адбываліся ў краіне. Сёння актыўна працуе над развіццём супрацоўніцтва таваравытворцаў і вучоных на постсавецкай прасторы, умацаваннем сувязяў навукі і вытворчасці.

Было сказана

**Рыгор БАРАДУЛІН, народны паэт Беларусі:**

*«Радасць чуе толькі сябе, як і маладосць».*

Любую матулю **Соф'ю Якаўлеўну СЯМЕЙКА** з в. Дукора Мінскай вобласці Пухавіцкага раёна **віншуем з юбілеем!** Здароўя, бадзёрасці, аптымізму, шчасця!
**З павагай і шчырай любоўю дзеці, муж, унукі!**

**НАРОДЖАНЫЯ 17 сакавіка**

**Гэтыя людзі пражываюць захапляльнае жыццё, поўнае імкненняў і прыгод. Без такой актыўнасці яны паступова згортваюцца ў «кокан» і адступаюць ад клопатаў, каб раптам (!) з'явіцца зноў у выглядзе цудоўнага матылька, які бесклапотна жыве пад сонцам. Яны павінны ўмець адстойваць свае прынцыпы, каб даказаць, што іх праекты і рэпутацыя трывалыя, не параўнальныя з імклівым жыццём матылька. Яны з лёгкасцю адмаўляюцца ад старых ідэй і звычаяў, не прызнаюць цынізму і кантролю за сабой. Ідучы да поспеху, яны павінны быць стрыманымі і скрупулёзнымі, каб аднойчы вярнуцца на зямлю і ўзяць на сябе сваю долю абавязкаў, праблем і цяжкасцяў.**

**НАРОДЖАНЫЯ 18 сакавіка**

**Яны прываблiваюць людзей, праяўляючы рысы лідара, зрэдку змяняюць свае планы і настойліва пераўтвараюць мроі ў рэальнасць. Маюць асаблівае пачуццё часу, праяўляюць найвялікшую цярплівасць, калі чакаюць зручнага выпадку, каб паказаць сябе. Іх пужае няпэўнасць, але яны ніколі не прымаюць да ўвагі дробязяў, засяроджваюцца на сітуацыі ў цэлым. У іх часта ўзнікаюць праблемы з дзецьмі: калі тыя становяцца самастойнымі, даюць ім поўную свабоду, якая выглядае не як падарунак, а як страшэнная абыякавасць. Ім не трэба з лёгкасцю паддавацца на ўгаворы, а па магчымасці прытрымлівацца сваіх перакананняў і поглядаў.**

■ Фестывалі

# «КЛАДЕЗЬ» ПРАВАСЛАЎНАЙ КУЛЬТУРЫ

**У Докшыцах прайшоў фестываль праваслаўнай культуры «Кладезь». Ён праводзіцца ў Беларусі, пачынаючы з 2008 года. Выступленні тэатра «Батлейка», праваслаўная выстава-кірмаш і многае іншае — традыцыйныя мерапрыемствы.**

— Гэтае царкоўна-грамадскае мерапрыемства спрыяе ўмацаванню ўзаемасувязі паміж царкоўнай і дзяржаўнай уладай. Адна з галоўных мэт фэсту — маральна-духоўнае выхаванне дзяцей і моладзі. Асноўныя распрацоўшчыкі і арганізатары праграмы — Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр і сястрынства ў гонар прападобнапакутніцы Вялікай княгіні Марыі (г. Мінск), — паведамілі «Звяздзе» ў Докшыцкім райвыканкаме.

Фестываль ужо прайшоў у розных гарадах Мінскай і Слуцкай, Тураўскай і Мазырскай, Гомельскай і Жлобінскай, Навагрудскай і Лідскай, Магілёўскай і Мсціслаўскай епархій. І вось яго сталіцай сталі Докшыцы.

У рамках кожнага фестывалю праводзяцца шматлікія мерапрыемствы і ажыццяўляюцца розныя праекты. У тым ліку праект «Добрае кіно» — з паказам фільмаў для людзей розных пакаленняў, антыалкагольны «Агульная справа» і іншыя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 7.18 | 19.19 | 12.01 |
| Віцебск | — 7.07 | 19.09 | 12.02 |
| Магілёў | — 7.08 | 19.09 | 12.01 |
| Гомель | — 7.04 | 19.06 | 12.02 |
| Гродна | — 7.33 | 19.34 | 12.01 |
| Брэст | — 7.33 | 19.35 | 12.02 |

**Месяц**

*Поўня 16 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Іраіды, Андрыяна, Івана, Канстанціна, Марка, Фёдара.*
***К.*** *Фаіны, Кірылы, Эдуарда.*



Фота Софі КУСЯНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +5..+7°C | КІЕЎ +9..+11°C | РЫГА +1..+3°C |
| ВІЛЬНЮС +6..+8°C | МАСКВА -2..0°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ -2..0°C |

## УСМІХНЕМСЯ

**Трэба тэрмінова нешта спыняць!.. Альбо есці, альбо ўзважвацца...**

Дзядзька Вася, рыбак з Пецярбурга, трапіў у Кнігу рэкордаў Гінэса: за апошнія 50 гадоў яго кожную вясну ратавалі з крыгі.

**Дзве сяброўкі:**
**— Дарагая, ты так папаўнела!**
**— Гэта я яшчэ пахудзела. Ты мяне месяц таму не бачыла. Была як ты!**

Брыгадзе, якая працавала на дне кар'ера, паведамілі, што прывезлі аванс. Так хутка па кар'ернай лесвіцы не ўздымаўся ніхто.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 22.315. Індэкс 63850. Зак. № 1139.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 сакавіка 2014 года.